# Вернутыя ў Беларусь кнігі са знакамітай калекцыі Храптовічаў прадстаўлены на выставе ў НББ

19.02.2023 10:15

**Унікальныя экспанаты — вернутыя ў Беларусь кнігі са знакамітага кніжнага збору Храптовічаў — упершыню прадстаўлены ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, паведамляе БелТА са спасылкай на НББ.**




Фота: Нацыянальная бібліятэка Беларусі

Каштоўныя выданні з бібліятэкі Храптовічаў былі вернутыя ў Беларусь з Германіі ў 2023 годзе дзякуючы дзейнасці дыпламатычнай місіі па вяртанні гісторыка-культурных каштоўнасцяў.

> Бібліятэка Храптовічаў існавала з другой паловы XVIII стагоддзя да пачатку XX стагоддзя ў маёнтку Шчорсы (цяпер Навагрудскі раён). Яе заснавальнікам быў канцлер Іаахім Літавор Храптовіч. Кніжная калекцыя ўжо ў *XVIII* стагоддзі лічылася адной з самых багатых ва Усходняй Еўропе. Бібліятэка ўключала творы антычных аўтараў, французскую і італьянскую класічную літаратуру, працы па гісторыі розных краін, рукапісы.

Два выданні канца XVIII-XIX стагоддзя на французскай мове, прысвечаныя падзеям, звязаным з такімі вядомымі гістарычнымі асобамі, як першы імператар Расійскай імперыі Пётр I і англійскі палкаводзец і палітычны дзеяч герцаг Мальбара Джон Чэрчыль, папоўняць калекцыю Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. На экзэмплярах ёсць адзнакі ранейшых уладальнікаў.

Азнаёміцца з унікальнымі выданнямі ў экспазіцыі Музея кнігі можна да 28 лютага 2023 года.

Навіны | Папуля

11:59 Два нацыянальны рэкорды ўстаноўлены чэмпіянаце Беларусі п трэку

11:38 Урад зніжае ко дзелавой драўніны дл фізічных асоб

11:17 БелАЭС стала л арганізацыі працы паж бяспекі

10:53 Двух рыбакоў в супрацоўнікі МНС у Га раёне

УСЕ НАВІНЫ